# КОНЦЕПТУАЛЬНЫЕ ПОДХОДЫ К ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКЕ ПЕДАГОГА

УДК 378.147

## ПРЫНЦЫП ПРЫРОДАЗГОДНАСЦІ Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

***Г.У. Болбас***
*УА МДПУ імя І.П. Шамякіна*
*г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

*Сучасныя адукацыйныя прыярытэты вызначаюць прынцып прыродазгоднасці ў якасці метаасновы тэарэтычных і практычных распрацовак у сферы вышэйшай педагагічнай адукацыі. У кантэксце светапоглядных установак біяцэнтрызму, экацэнтрызму і культурацэнтрызму дадзены прынцып пашырае свае змястоўна-сэнсавыя формы і ўяўляе сабой рэсурс развіцця ў студэнцкай моладзі прыродаахоўных і рэсурсазберагальных мыслення і паводзін. Істотны патэнцыял фарміравання прыродазгоднага светаразумення ў будучых настаўнікаў змяшчаюць спецкурсы па прыродазгоднай педагогіцы.*

*Ключавыя словы: прынцып прыродазгоднасці; метапрынцып; прыродазгоднае выхаванне; педагагічная адукацыя; біяцэнтрызм; экацэнтрызм; культурацэнтрызм; цэласнасць.*

Адной з прыярытэтных задач сучаснай адукацыйнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца культываванне ў дзяцей і вучнёўскай моладзі прыродаахоўных і рэсурсазберагальных мыслення і паводзін, фарміраванне ў іх вопыту стваральнай дзейнасці ў сістэме “чалавек – грамадства – прырода”. Пастаўленая задача для сферы вышэйшай педагагічнай адукацыі набывае асаблівую актуальнасць, так як ад эфектыўнасці падрыхтоўкі педагагічных кадраў залежыць вынік яе ажыццяўлення ў агульнаадукацыйнай школе. Акрамя таго, педагагічная ВНУ як ніякая іншая рэалізуе выхаваўчую функцыю. Адукацыйны працэс у яе сценах накіраваны перш за ўсё на фарміраванне каштоўнасна-сэнсавых установак будучага спецыяліста, яго ўнутранай культуры і высокамаральных паводзін, якія з’яўляюцца абавязковымі характарыстыкамі педагога-прафесіянала, атрыбутамі чалавека, які традыцыйна выступае ўзорам для пераймання ў падрастаючых пакаленняў.

Неабходнасць гарманізацыі чалавека і навакольнага свету ў кантэксце падобных перакананняў нацэльвае на ўспрыманне сучаснага настаўніка не столькі як крыніцы ведаў аб талерантным узаемадзеянні

МГПУ им. И.П.Шамякина

асяроддзя і грамадства, колькі непасрэдна як носьбіта прыродазгоднага светапогляду. У гэтай сувязі ўменні студэнтаў ажыццяўляць працэс прыродазгоднага выхавання выступаюць другаснымі ў адносінах да іх уменняў ператвараць у рэчаіснасць прыродазгоднасць выхавання. На першы погляд, здавалася б, гульня слоў указвае на тое, што *шлях да прыродазгоднасці выхавання павінен быць прыродазгодным*, гэта значыць рэалізаваны з дапамогай жывых зносін і нязмушанай сумеснай дзейнасці педагога і выхаванцаў, а не мерапрыемстваў для «галачкі» і павучанняў, якія не адпавядаюць прыродзе чалавека.

Для вырашэння гэтай няпростай задачы ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў ключавымі павінны выступаць сістэмныя і цэласныя адукацыйныя стратэгіі, накіраваныя на станаўленне парытэтных адносін чалавека да навакольнага свету. Больш за тое, прынцып прыродазгоднасці варта вызначыць метадалагічнай базай, якая дэтэрмінуе змястоўна-мэтавы і арганізацыйна-метадычны кампаненты адукацыйнага працэсу.

Інтэрпрэтацыя дадзенага прынцыпу толькі як уліку індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў звужае багацце яго змястоўна-сэнсавых формаў, якія гістарычна эвалюцыянуюць і трансфармуюцца ў часе. Сутнаснае напаўненне прынцыпу прыродазгоднасці ў сучаснай адукацыйнай прасторы абумоўлена пераважна светапогляднымі ўстаноўкамі *біяцэнтрызму, экацэнтрызму і культурацэнтрызму*. Гэта, у сваю чаргу, вызначыла магчымасць тэарэтычнай дыферэнцыяцыі прынцыпу прыродазгоднасці ў сістэме педагагічных катэгорый і яго інтэрпрэтацыю ў якасці метапрынцыпу гуманістычнай педагогікі, здароўезберагальнай педагогікі, карэкцыйнай педагогікі, нейрапедагогікі, наасфернай педагогікі, народнай педагогікі, экапедагогікі.

У рамках біяцэнтрычнай канцэпцыі з'явы гуманітарных навук, у тым ліку педагогікі, атрымліваюць навуковае асэнсаванне з дапамогай законаў натуральных навук. Такое адзінства не толькі ўзбагачае навукі, але і стварае магчымасці для інтэграцыі ведаў пра чалавека і прыроду як адзіную цэласную сістэму. У працах прыхільнікаў дадзенага падыходу разглядаемы прынцып выступае ў цеснай сувязі з біялогіяй, анатоміяй, псіхалогіяй, медыцынай і інш. і атрымлівае інтэрпрэтацыю праз адзінства з імі. Як вынік на стыку педагогікі і дыферэнцыяльнай псіхалогіі паўстаў накірунак нейрапедагогікі, дзе прыродазгоднасць мяркуецца як улік нейрапсіхалагічных асаблівасцей асобы, у прыватнасці, функцыянальных асіметрый мозгу. У рамках нейрапедагогікі прынцып прыродазгоднасці выхавання выступае ў якасці метадалагічнага падмурку здароўезберагальнай педагогікі, з'яўляецца абгрунтаваннем адукацыйнай сістэмы, адэкватнай асаблівасцям прыроднага развіцця дзяцей.

У апошні час прыродазгоднасць усё часцей выступае як прынцып карэкцыйнай педагогікі, што перш за ўсё абумоўлена цікавасцю людзей да



МГПУ им. И.П.Шамякина

анамалій чалавечай прыроды. Калі Арыстоцель гаварыў пра недастатковасць і нясконччанасць прыроды чалавека ад Бога, то сёння мы сутыкаемся з разуменнем яе як парушанай і пашкоджанай у выніку дзеянняў самога чалавека. Такім чынам, прыродазгоднасць уяўляе сабой прынцып выхавання і навучання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, прафілактыкі парушэнняў рознага характару.

Выбар прынцыпу прыродазгоднасці ў якасці аднаго з сучасных адукацыйных прыярытэтаў таксама абумоўлены неспрыяльнай экалагічнай сітуацыяй і, як вынік, праходжаннем працэсу фарміравання асобы ва ўмовах абвастрэння інстынкту самазахавання і захавання навакольнага свету. Антрапалагічнае разуменне чалавека, якое прадугледжвае яго прыярытэт у свеце прыроды, выцясняецца спробамі каэвалюцыі, цэласнасці, адзінства, якія вяртаюць яго ў кантэкст прыроды і разглядаюць у цеснай сувязі з ім. Экацэнтрызм становіцца адной з светапоглядных установак сучаснага грамадства, таму мэтай выхавання выступае цэласная і гарманічная асоба як носьбіт прыродазгоднага светапогляду. Такое пераадоленне сучаснай навукай традыцыйнага разумення прыроды і чалавека накіроўвае ўвагу вучоных на вывучэнне экалагічнай сутнасці прынцыпу прыродазгоднасці выхавання.

Пры культурацэнтрычнай мадэлі светаразумення прыроду чалавека вызначаюць яго тварэнні, што абумоўлена перш за ўсё, на думку даследчыка А.М. Дахіна, тым, што “чалавек навязаў свету інфармацыйныя вобразы, імёны, сімвалы і ўжо пасля гэтага працягвае свой дыялог з штучна змадэляваным ім светам” [1, с. 43]. У рамках культуры тэхнагеннай цывілізацыі чалавек з нястомнай упартасцю спрабуе стварыць сабе падобнага рознымі спосабамі і з максімальнай ступенню дакладнасці. Педагагічная заканамернасць пачынае выступаць у ролі матэматычнай для таго, каб працэсам фарміравання асобы можна было кіраваць і “кланаваць” або прайграваць па зададзеным узоры. У выніку, адзначаецца рухомасць і ўзаемапераход прынцыпаў прыродазгоднасці і культуразгоднасці.

Прынцып культуразгоднасці не столькі супрацьстаіць прынцыпу прыродазгоднасці, колькі ўзбагачае сэнс біягенетыкі. Больш за тое, ступень прыпадаблення выхавання прыродзе напрамую залежыць ад маральных нормаў, культуры і традыцый канкрэтнага народа. У апошнія дзесяцігоддзі ў процівагу праявам тэхнагеннай цывілізацыі, працэсам глабалізацыі адбываецца ўсплёск цікавасці да арганічнасці этнічнай культуры, у тым ліку і да этнапедагогікі, што спрыяе асэнсаванню прынцыпу прыродазгоднасці выхавання ў кантэксце традыцыйнай культуры розных народаў. Прыродазгоднасць у дадзеным выпадку разглядаецца як спараджэнне натуральнасцю народнага выхавання, зліццём чалавека з прыродай і жыццём. Навукоўцы лічаць, што сутнаснае значэнне прынцыпу заключаецца ў вопыце народнага выхавання ў імпліцытным стане.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Аналіз змястоўна-сэнсавых формаў прынцыпу прыродазгоднасці дае падставы сцвярджаць, што ён заключае ў сабе патэнцыял метаасновы сучаснай адукацыі. У сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў прыродазгоднасць павінна выступаць агульнафіласофскім базісам выхавання і навучання, які валодае ўніверсальнай ужывальнасцю як у дачыненні да педагагічных тэорый і сістэм, так і прыватных методык і тэхналогій навучання.

У гэтай сувязі актуальным уяўляецца ўвядзенне спецкурсаў, якія дазваляюць студэнтам авалодаць тэарэтычнымі і практычнымі ведамі ў галіне прыродазгоднай педагогікі. Так, у Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя І.П. Шамякіна маецца вопыт правядзення спецкурса "Прыродазгодная педагогіка: гісторыя і сучаснасць", ключавымі задачамі якога выступілі:

- фарміраванне ў студэнтаў базавага паняційнага апарату прыродазгоднай педагогікі;
- асэнсаванне філасофска-педагагічнай сутнасці прынцыпу прыродазгоднасці як метадалагічнай асновы сучаснага выхавання і адукацыі;
- азнаямленне з асаблівасцямі гістарычнага развіцця прынцыпу прыродазгоднасці ў замежнай і айчыннай педагогіцы;
- аналіз сучаснага стану праблем прыродазгоднага выхавання і навучання;
- азнаямленне з канцэпцыямі, методыкамі і мадэлямі прыродазгоднага выхавання і навучання;
- фарміраванне ўменняў і навыкаў выкарыстання ідэй прыродазгоднай педагогікі ў прафесійнай дзейнасці настаўніка [2].

У якасці тэм для абмеркавання на лекцыйных і семінарскіх занятках сталі: "Тэарэтыка-метадалагічныя асновы прыродазгоднай педагогікі", "Развіццё прынцыпу прыродазгоднасці ў замежнай педагогіцы", "Генезіс і развіццё ідэй прыродазгоднасці ў гісторыі педагогікі Беларусі", "Прыродазгодныя падыходы ў практычнай арганізацыі асветы ў Беларусі XVI–XVII стст.", "Прынцып прыродазгоднасці выхавання ў тэорыі савецкай педагогікі", "Прынцып прыродазгоднасці выхавання ў вядучых напрамках сучаснай педагагічнай навукі", "Здароўезберажэнне ў сістэме прыродазгоднай адукацыі", "Прыродазгодныя тэхналогіі навучання і выхавання", "Прыродазгодная арганізацыя адукацыйнай прасторы сучаснай школы". Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў асаблівую цікавасць у студэнтаў выклікала распрацоўка тэматычных праектаў "Школа. Адукацыя. Здароўе", "Прыродазгодная школа – школа будучыні", "Новая парадыгма адукацыі: ад механізма – да арганізма" і інш. Эсэ-разважанні ("Усё з уласных каранёў", "Прыродазгодная педагогіка – гэта, калі ўрок – працяг жыцця, а жыццё – працяг урока" і інш.) і міні-даследаванні ("Фальклор як сродак прыродазгоднага выхавання", "Біяадэкватныя падручнікі XXI ст." і інш.) адлюстравалі глыбіню

МГПУ им. И.П. Шамякина

разумення студэнтамі праблем прыродазгоднай педагогікі і падкрэслілі неабходнасць чытання падобных спецкурсаў пры падрыхтоўцы педагагічных кадраў.

Такім чынам, выбар прынцыпу прыродазгоднасці выхавання ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў у якасці стратэгічнага заключае вялізныя магчымасці для рэалізацыі задач ўзгодненага развіцця чалавека і прыроды.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Дахин, А.Н. Педагогика и синергетика: «вместе тесно, а порознь пресно» / А.Н. Дахин, Р. Коэн // Философия образования. – 2007. – № 1. – С. 39–44.
2. Природосообразная педагогика: история и современность : учебная программа спецкурса для пед. специальностей высших учебных заведений / сост. Г.В. Болбас. – Мозырь : УО МГПУ им. И.П. Шамякина, 2011. – 29 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина